УДК 9:331.105 (476)+331.107

# Удзел прафсаюзаў Беларусі ў арганізацыі і кіраванні вытворчасцю ў перыяд НЭПа (1920-я гг.)

Дубовік А. А.
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

X з’езд РКП(б), які адбыўся ў сакавіку 1921 г. і паклаў пачатак пераходу да НЭПа, заклікаў прафсаюзы прыняць актыўны ўдзел у арганізацыі і кіраванні вытворчасцю. Пасля гэтага прафсаюзы значна актывізавалі эканамічную работу. З мэтай рацыянальнага выкарыстання прафсаюзных работнікаў у лістападзе 1921 г. аддзел нарміравання працы і эканамічны аддзел былі аб’яднаны ў адзіны аддзел Саўпрафбела. Такія тарыфна-эканамічныя аддзелы ствараліся і ў іншых прафсаюзных органах і мелі важнае значэнне для адраджэння гаспадарчага жыцця рэспублікі. Асабліва вялікай была іх роля ў першыя гады НЭПа, калі гаспадарчы апарат Беларусі быў яшчэ слабы, нявопытны, і на прафсаюзы легла большая частка работы па арганізацыі вытворчасці. Толькі за адзін год з чэрвеня 1922 г. праўленнямі губернскіх аддзелаў і павятовых аддзяленняў галіновых прафсаюзаў БССР было разгледжана 1235 вытворчых пытанняў. Прафсаюзы ўдзельнічалі ў распрацоўцы вытворчых планаў прадпрыемстваў, у фарміраванні гаспадарчых органаў (групавых упраўленняў, трэстаў), камплектаванні іх адказнымі работнікамі, заслухоўвалі справаздачы іх кіраўнікоў на сваіх пасяджэннях. Адказны сакратар Цэнтральнага Бюро прафсаюзаў БССР А.Я. Калнін у 1924 г. быў прызначаны Старшынёй Прэзідыума ВСНГ БССР. Важнае значэнне для аднаўлення прамысловасці меў перавод дзяржаўных прадпрыемстваў на гаспадарчы разлік, які пачаўся ў другой палове 1921 г. і закончыўся ў пачатку 1923 г.

Перабудова вытворчай работы прафсаюзаў у перыяд НЭПа праявілася ў адмове іх ад непасрэднага ўмяшання ў кіраванне прамысловасцю, у пераходзе да цеснага партнёрства з дзяржавай у гаспадарчым будаўніцтве, у далучэнні рабочых і служачых да кіравання вытворчасцю праз вытворчыя нарады і камісіі, якія пачалі стварацца на прадпрыемствах у першыя гады НЭПа. Масавы характар у БССР яны набылі ў 1924 г., калі дзейнічалі на большасці заводаў і фабрык. З кожным годам вытворчыя нарады ахаплівалі ўсё больш шырокія пласты рабочых. У 1927 г. у іх працы ўдзельнічалі ўжо 23–24% рабочых і служачых прамысловасці БССР. Вытворчыя камісіі і нарады садзейнічалі вылучэнню рабочых на кіруючую гаспадарчую работу. Разам з тым у працы вытворчых нарад было шмат хібаў, галоўныя з якіх – невысокі працэнт выканання прапаноў (менш паловы) і фармалізм.